***Яўген Аляксандравіч Гурынаў***
Фонд развіцця і падтрымкі арменазнаўчых даследванняў “Анів”
Мінск, Беларусь
кандыдат гістарычных навук
gurinoveugene@gmail.com

# УСЫНАЎЛЕННЕ Ў СТАРАЖЫТНЫМ РЫМЕ, ВІЗАНТЫІ І СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ: ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ

У Старажытным Рыме найбольшае распаўсюджанне атрымалі два віды ўсынаўлення: *adrogatio* і *adoptio*. У абодвух выпадках ключавым аспектам быў пераход таго, каго ўсынаўлялі, пад бацькоўскую ўладу (*patria potestas*) таго, хто ўсынаўляў. Звычайна да ўсынаўлення прыбягалі, каб павялічыць колькасць чальцоў сям’і і праз тое узмацніць яе ўплыў у грамадстве, захаваць прыватны культ (*sacra privata*), радавое імя (*nomen*) і сам род. У імператарскі перыяд інстытут ўсынаўлення зведаў важныя змены, якія былі выклікаIны памяншэннем значэння агнатычнай роднасці і, адпаведна, павелічэннем значэння роднасці кагнатычнай. Быў пашыраны спіс тых, каму дазвалялася ўсынаўляць, спрасціліся цырымоніі *adrogatio* і *adoptio*.

Адрозненні паміж *adrogatio* і *adoptio* канчаткова нівеліраваліся ў Візантыі да пачатку X ст. Замест пераходу прыёмнага сына ці дачкі пад уладу (*patria potestas*) прыёмнага бацькі цяпер паміж двума бакамі ўсталёўваліся асабістыя квазінатуральныя адносіны па мадэлі “бацька — дзіця”. Тыя, хто не меў дзяцей, прыбягалі да ўсынаўлення, каб забяспечыць сябе спадчыннікамі, а таксама дзеля “суцяшэння” на старасці гадоў. Быў зняты шэраг абмежаванняў, якія раней былі звязаны з асаблівасцямі агнатычнай роднасці. Больш гнуткімі і варыятыўнымі зрабіліся ўмовы, што знайшло сваё адлюстраванне ў шматлікіх дамовах аб усынаўленні. Пэўную ролю ў цырымоніі пачала адыгрываць царква, а сама цырымонія зблізілася з абрадам хросту.

На лацінскім Захадзе ўсынаўленне, з фармальнага пункту гледжання, мела падабенствы з аналагічным старажытнарымскім інстытутам. Сярэднявечныя юрысты паранейшаму працягвалі вылучаць два асноўных віды ўсынаўлення (*adrogatio* і *adoptio*) і адводзіць цэнтральнае месца *patria potestas*. Аднак, у параўнанні з Антычнасцю, заходнееўрапейскі інстытут па сваёй сутнасці зведаў сур’ёзныя змены. Дзяцей усынаўлялі, каб займець спадчынніка і апякуна на старасці гадоў. Як і ў Візантыі, спрасцілася працэдура, а адрозненні паміж *adrogatio* і *adoptio* практычна нівеліраваліся. Цяпер той, каго ўсынаўлялі, звычайна захоўваў сувязь са сваёй натуральная сям’ёй і пераходзіў пад уладу прыёмнага бацькі толькі ў тым выпадку, калі апошні быў ягоным блізкім кроўным родзічам (напрыклад, дзедам). Атрымалі распаўсюджванне дагаворы аб усынаўленні. Але захаваліся абмежаванні на ўсынаўленне дзяцей еўнухамі і жанчынамі.

Можна казаць пра тое, што з юрыдычнага пункту гледжання інстытут ўсынаўлення ў Сярэднявеччы больш абараняў правы тых, каго ўсынаўлялі, чым тых, хто ўсынаўляў. Тым самым ён набліжаўся да аналагічнага сучаснага інстытута.